**Описание специализированного модуля по выбору студента**

| | | |
|---|---|---|
| 1 | Название специализированного модуля по выбору студента | **Станаўленне і развіццё беларускай дзяржаўнасці** |
| 2 | Трудоемкость в зачетных единицах | На спецыялізаваны модуль вучэбным планам адводзіцца 72 гадзіны, у тым ліку аўдыторных 34 гадзін (лекцый-18, семінарскіх заняткаў-16 гадзін), (2 залiковых адзінкі). |
| 3 | Степень, звание, фамилия, имя, отчество преподавателя | Мяньчэня С.В., старшы выкладчык кафедры філасофіі і гісторыі. |
| 4 | Цели специализированного модуля по выбору студента | выпрацоўка аб'ектыўнага навуковага погляду на гісторыю дзяржаўнасці беларускага народа, якая прайшла шмат этапаў і развівалася ў працэсе ўзаемадзеяння розных сацыяльна-эканамічных, этнакультурных, геапалітычных і культурна-цывілізацыйных фактараў, абгрунтаванне месца і ролі Рэспублікі Беларусь у сучасным шматпалярным свеце і вызначэнне перспектывы развіцця краіны як сацыяльна-арыентаванай незалежнай краіны. |
| 5 | Пререквизиты (обязательная дисциплина интегрированного модуля) | Прэрэквізітам спецыялізаванага модуля «Станаўленне і развіццё беларускай дзяржаўнасці» з'яўляецца інтэграваны модуль "Гісторыя". |
| 6 | Содержание специализированного модуля по выбору студента | **1. Прадмет і задачы курса “Станаўленне і развіццё беларускай дзяржаўнасці”**<br>Паняцці “дзяржава” і “дзяржаўнасць”. Гістарычныя перадумовы і прычыны ўзнікнення дзяржавы. Традыцыі дзяржаўнасці ў славянскім свеце. Асноўныя этапы станаўлення і развіцця беларускай дзяржаўнасці. Паходжанне і эвалюцыя назвы “Белая Русь”. Тапонімы-этнонімы і этнічныя межы беларусаў. Гісторычная і сучасная дзяржаўная сімволіка Беларусі. Герб, Сцяг і Гімн Рэспублікі Беларусь. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь як асноўны закон краіны. Базавыя прынцыпы дзяржаўна-палітычнага ладу Рэспублікі Беларусь. Дзяржаўнасць Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе і перспектывы яе развіцця.<br><br>**2. Першыя дзяржавы-княствы на тэрыторыі Беларусі**<br>***2.1. Дзяржаватворчыя працэсы на тэрыторыі Беларусі ў канцы І – пачатку ІІ тыс. н.э.*** Прычыны і механізмы ўзнікнення дзяржаўнасці ва Усходняй Еўропе ў канцы І тыс. н.э. Працэс фарміравання першых дзяржаўных цэнтраў на тэрыторыі Беларусі. Полацкае княства – першая беларуская дзяржава. Рагвалод – першы полацкі |

| | | |
|---|---|---|
| | | князь. Ізяслаў Уладзіміравіч і аднаўленне дзяржаўнасці Полацкага княства. Полацкае княства ў XI ст. – час княжання Брачыслава Ізяславіча і Усяслава Брачыславіча Чарадзея – эпоха найвышэйшага росквіту і магутнасці Полацкага княства. Полацкае княства ў перыяд феадальнай раздробленасці (XII–XIII стст.). Тураўскае княства. Раннесярэднявечныя дзяржаўныя ўтварэнні ў Беларускім Падзвінні, Пасожжы і Панямонні.<br>***2.2. Сістэма дзяржаўнай улады на тэрыторыі Беларусі ў старажытнарускі час.*** Князь і княжацкая ўлада. Веча і яго функцыі. Заканадаўча-прававая база функцыянавання княжацкай улады – "Руская праўда", як звод звычаёва-прававых нормаў. Роля царквы ў дзяржаўным і палітычным жыцці.<br><br>**3. Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае – беларуска-літоўская дзяржава.**<br><br>***3.1. Прычыны ўтварэння і працэс фарміравання Вялікага Княства Літоўскага.*** Першая згадка аб гістарычнай Літве. Тэрыторыя і насельніцтва гістарычнай Літвы. Працэс фарміравання дзяржаўнасці і ўзмацненне гістарычнай Літвы. Знешнія і ўнутраныя фактары фарміравання ВКЛ. Роля крыжацкай і мангола-татарскай агрэсіі ў фарміраванні ВКЛ. Міндоўг – першы князь ВКЛ, Навагрудак – першая сталіца ВКЛ. ВКЛ у апошнія дзесяцігоддзі XIII ст. Умацаванне ВКЛ пры вялікім князі Віцені. ВКЛ у часы вялікага князя Гедыміна – пачатак актыўнага пашырэння тэрыторыі дзяржавы на ўсход і поўдзень. Прычыны і механізмы ўключэння ўсходнеславянскіх земляў у склад ВКЛ. ВКЛ у часы Альгерда і Кейстута.<br>***3.2. Вялікае Княства Літоўскае ў канцы XIV – сярэдзіне XVI ст.*** Вялікі князь Ягайла і Крэўская ўнія. Пачатак шырокага распаўсюджання каталіцтва ў ВКЛ. Вялікі князь Вітаўт і час найвышэйшай магутнасці ВКЛ. Грунвальдская бітва і яе роля ў гісторыі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Грамадзянская вайна ў ВКЛ у 1432–36 гг. ВКЛ у часы праўлення першых Ягелонаў. ВКЛ у першай палове XVI ст. – час найвышэйшага росквіту культуры і нарастанне знешнепалітычных праблем. Войны з Маскоўскай дзяржавай і Крымскім ханствам.<br>***3.3. Дзяржаўна-палітычны лад ВКЛ.*** Вялікі князь. Вышэйшыя дзяржаўныя пасады. Паны-рада. |

| | | |
|---|---|---|
| | | Агульнадзяржаўны сойм і павятовыя соймікі. Асноўныя саслоўі – магнаты, шляхта, святары, мяшчане, сяляне. Права горада на самакіраванне – традыцыйнае ўсходнеславянскае гарадское права ("Права Рускае"), Магдэбургскае права.<br><br>**4. Грамадска-палітычны лад у Беларусі ў перыяд Рэчы Паспалітай.**<br>***4.1. Рэч Паспалітая – польска-беларуска-літоўска-ўкраінская дзяржава.*** Прычыны заключэння Люблінскай уніі (цяжкае ваенна-палітчнае становішча ВКЛ у выніку Лівонскай вайны). Люблінская ўнія – пазіцыі бакоў і ход перамоў. Вынікі і наступствы заключэння Люблінскай уніі для ВКЛ. Эпоха грамадска-палітычнага "адраджэння" у ВКЛ у апошнія дзесяцігоддзі XVI ст. Стварэнне Галоўнага Трыбуналу ВКЛ. Трэці Статут ВКЛ. Леў Сапега як дзяржаўны і палітычны дзеяч.<br>***4.2. Рэч Паспалітая ў XVII–XVIII стст.*** Выбарнасць караля, "залатыя шляхецкія вольнасці" і неабмежаваная ўлада магнатаў як фактары аслаблення дзяржаўна-палітычнага ладу РП. Пачатак працэсу апалячвання і акаталічвання беларуска-літоўскай шляхты. Войны сярэдзіны XVII – пачатку XVIII стст. (казацка-сялянская вайна, вайна 1654–1667 гг., Паўночная вайна) і пачатак эканамічнага і палітычнага заняпаду РП. Праўленне апошняга караля і вялікага князя Станіслава Аўгуста Панятоўскага – спробы рэформ, Канстытуцыя 3 мая 1791 г. Прычыны падзелаў РП. Нацыянальна-вызваленчае паўстанне 1794 г. пад кіраўніцтва Тадэвуша Касцюшкі.<br><br>**5. Беларускія землі ў складзе Расійскай Імперыі.**<br>***5.1. Дзяржаўная палітыка расійскіх улад на тэрыторыі Беларусі.*** Пазіцыя расійскіх улад да далучаых тэрыторый. Фарміраванне расійскай сістэмы кіравання. Канфесійная і этнічная палітыка. Змены ў палітыцы самадзяржаўя пасля паўстання 1830 -1831 гг. Дзейнасць Камітэта па справах Заходніх губерняў. Полацкі царкоўны сабор. Пашырэнне расійскага ўплыву ў сувязі з паўстаннем 1863 – 64 гг. Буржуазна-дэмакратычныя рэформы 60 - 70-х гг. і іх асаблівасці на Беларусі. Беларускае пытанне ў дзяржаўнай палітыцы і праграмах палітычных партый у канцы XIX – пач. XX стст.<br>***5.2. Грамадскі рух на Беларусі ў XIX – пач. XX ст.ст. Фарміраванне беларускай нацыянальнай ідэі.*** Адносіны насельніцтва Беларусі да падзелаў |

Рэчы Паспалітай і расійскіх улад. Спробы адраджэння Рэчы Паспалітай. Варшаўскае герцагства і спадзяванні на Напалеона Банапарта. План Агінскага. Дзейнасць таемных арганізацый у першай чвэрці XIX ст. Шляхецкае паўстанне 1830-31 гг.. Паўстанне 1863 – 64 гг.. В.-К. Каліноўскі. Ідэі дзяржаўнасці ў ідэалогіях заходнерусізму і краёвасці. Дзейнасць беларускіх народнікаў. Группа “Гоман”. Ф. Багушэвіч. Утварэнне і дзейнасць БСГ. “Наша ніва”. Дэпутаты ад беларускіх губерняў у Дзяржаўнай Думе Расійскай Імперыі.

**6. Спробы і формы рэалізацыі беларускай дзяржаўнасці ў гады Першай сусветнай вайны і рэвалюцыйных пераўтварэнняў (1914 - 1921).**

***6.1. Беларускае пытанне ў гады Першай сусветнай вайны.*** Становішча Беларусі і беларускі нацыянальны рух ў гады Першай сусветнай вайны (1914 -1917 гг.). Праэкты Канфедэрацыі ВКЛ і Балтыйска-Чарнаморскага саюза. Лютаўская рэвалюцыя 1917 гг. і беларускае пытанне. Падзеі кастрычніка 1917 гг. і станаўленне савецкай улады на Беларусі. Заходняя вобласць. Першы Ўсебеларускі з’езд. Абвяшчэнне БНР і дзейнасць яе Рады. Гістарычнае значэнне абвяшчэння БНР.

***6.2. Стварэнне беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове.*** Беларускае пытанне і бальшавікі. Белнацком і беларускія секцыі РКП(б). Заходняя камуна. Утварэнне ССРБ. Першы Усебеларускі З’езд Саветаў. Канстытуцыя ССРБ. ЛітБелССР. Адраджэнне Польшчы і пазіцыя польскага кіраўніцтва ў дачыненні да Беларусі. Беларусь ва ўмовах польска-савецкай вайны (1919-1920 гг.). Партызанскі рух. Дзейнасць урада БНР. Паўторнае абвяшчэнне ССРБ 31 ліпеня 1920 гг. Баявыя дзеянні лета-восені 1920 гг. С. Булак-Балаховіч. Слуцкае паўстанне. Сярэдняя Літва. Рыжскі мір.

**7. Развіццё беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове.**

***7.1. Беларусь у міжваенны перыяд (1921-1939).*** Становішча БССР пасля Рыжскага міра. Роля БССР у стварэнні Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. Беларусізацыя як сродак умацавання беларускай дзяржаўнасці на савецкай аснове. Узбуйненні БССР 1924 і 1926 гг. Усталяванне аднапартыйнай сістэмы. Берлінская канферэнцыя 1925 г. БССР ва ўмовах таталітарнага рэжыма і культа асобы І. Сталіна. Палітычныя рэпрэсіі.

Беларускае пытанне ў міжваеннай Польшчы.

| | | |
|---|---|---|
| | | Сістэма польскай адміністрацыі і сацыяльна-палітычныя пераўтрарэнні польскіх улад. Змены ў палітыцы ва ўмовах рэжыма "санацыі". Нацыянальна-вызваленчы рух. Камуністычная партыя Заходняй Беларусі. Б. Тарашкевіч. ТБШ. Беларуская хрысціянская дэмакратыя.<br>***7.2. Выпрабаванні беларускай дзяржаўнасці ў гады Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай вайны.*** Станаўленне блоку агрэсіўных дзяржаў. Пачатак Другой суственай вайны і баявыя дзеянні верасня 1939 г. Уз'яднанне беларускага народа ў складзе БССР. Народны сход Заходняй Беларусі і яго рашэнні. Саветызацыя Заходняй Беларусі. Тэрытарыяльныя саступкі Літве 1939 і 1940 гг. Стан БССР напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны і акупацыя Беларусі. Акупацыйны рэжым і ліквідацыя беларускай дзяржаўнасці. Будучыня Беларусі ў планах дзеячаў калабарацыі. Беларусь у кантэксце "польскага пытання" на канферэнцыях кіраўнікоў антыгітлераўскай кааліцыі. Вызваленне Беларусі. Уклад беларускага народа ў перамогу над нацысцкай Германіяй.<br>***7.3. Развіццё БССР у 1945-1985 гг.*** Аднаўленне савецкага дзяржаўнага ладу і супярэчнасці грамадска-палітычнага развіцця першага пасляваеннага дзесяцігоддзя. Вызначэнне дзяржаўнай мяжы з Польшчай. БССР ў гады "хрушчоўскай адлігі". Згортванне працэсаў лібералізацыі ў гады кіравання Л. Брэжнева. К. Мазураў і П. Машэраў, іх роля ў развіцці БССР. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае становішча Савецкага Саюза ў першай палове 80-х гг. Удзел БССР у стварэнні ААН. БССР на міжнароднай арэне (1945-1985 гг.).<br>**8. Суверэнная Рэспубліка Беларусь**<br>***8.1. Станаўленне незалежнасці Рэспублікі Беларусь.*** Палітыка "перабудовы" і крызіс савецкага дзяржаўнага ладу. Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР 27 ліпеня 1990 г.. Рэферэндум сакавіка 1991 г. Жнівеньскі путч 1991 года ў Маскве і яго вынікі. Закон ад 19 верасня 1991 года. Белавежскія пагадненні і ўтварэнне СНД. Прычыны і вынікі распаду СССР.<br>***8.2 Дзяржаўнае будаўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь.*** Прыняцце Канстытуцыі 1994 года і ўвядзенне прэзідэнцкага кіравання. Рэферэндум 1995 года. Нарастанне супярэчнасцей і канстытуцыйны крызіс 1996 г. Фарміраванне новых органаў дзяржаўнай улады. Усебеларускія народныя |

| | | |
|---|---|---|
| | | сходы і іх рашэнні. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё Беларусі ў пач. XXI ст. Рэспубліка Беларусь ў геапалітычных працэсах канца XX – пач. XXI стст.: асноўныя вектары знешняй палітыкі. |
| 7 | Рекомендуемая литература | 1. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – XXI ст. У 2 кн. Кн. 1/ А.А. Каваленя [і інш.]; рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск: Беларус. навука, 2011.-584 с.<br>2. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – XXI ст. У 2 кн. Кн. 2/ А.А. Каваленя [і інш.]; рэдкал.: А.А. Каваленя [і інш.]; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск: Беларус. навука, 2012.-654 с.<br>3. Новік, Я.К. Гісторыя Беларусі. Ад старажытных часоў па 2008 г.: вучэб. дапаможнік для студ. вну / Я.К. Новік, І.Л. Качалаў, Н.Я. Новік; пад рэд. Я.К. Новіка.–Мінск: Вышэйшая школа, 2009.–512 с.<br>4. Беларусь на мяжы тысячагоддзяў / рэдкал.: А.П. Вайтовіч [і інш.]; маст. афарм. У.М. Жука. – Мінск: Беларуская Энцыклапедыя, 2000.–432 с.<br>5. Гісторыя Беларусі: вучэбна-метадычны комплекс / БДАТУ, Кафедра філасофіі і гісторыі; [склад.: В.Г. Маскалеў і інш.].–Мінск, 2009.–164 с.<br>6. Гісторыя Беларусі: навучальны дапаможнік / А.Г. Каханоўскі [и др.].–Мінск: Выдавецкі цэнтр "Экономпресс", 1997.<br>7. Гісторыя Беларусі: навуч. дапаможнік: у 3-х ч.. Ч. 1: Са старажытных часоў да пачатку XIX стагоддзя / І.І. Коўкель [і інш.]; рэдкал.: І.П. Крэнь (старшыня) [і інш.].–2-е выд., выпраўлен. і дап.– Гродна: Мін. адукацыі РБ, ГДУ імя Я. Купалы, 1994.–263 с.<br>8. Протько, Т.С. Становление советской тоталитарной системы в Беларуси (1917–1941 гг.) / Т. С. Протько.–Минск: Тесей, 2002.–688 с.<br>9. Юхо, Я.А. Кароткі нарыс гісторыі дзяржавы і права Беларусі: вучэб. дапам. / Я.А. Юхо.–Мінск: Універсітэцкае, 1992. |
| 8 | Методы преподавания | Кампаратыўны, праблемны, дыялогавага-эўрыстычны, наглядны, метад фарміравання асобаснай значнасці ведаў |
| 9 | Язык обучения | Беларуская, руская |

Заведующий кафедрой ____________ Гребень Е.А.